Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

# ХАРАВЫ КЛАС

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнік**

*С.І.Дробыш,* загадчык кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання музычна-педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка”;

*І.К.Абразевіч,* галоўны хормайстар дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І.Цітовіча”, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 19.10.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 11.11.2010 г.);

*навукова-метадычным* саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 11 ад 25.11.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *С.І.Дробыш*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма “Харавы клас” распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 “Спевы (народныя)”.

Актыўны ўдзел у творчай дзейнасці харавога калектыву садзейнічае набыццю пэўных ведаў у галіне асноўных кірункаў харавога выканальніцтва, стылёвых асаблівасцей сучаснага народна-харавога выканання і яго мясцовых традыцый, а таксама ў пазнанні заканамернасцей развіцця народнапесеннай творчасці.

У час спеваў развіваюцца навыкі народнапесеннага выканальніцтва (народная манера, імправізацыя, калектыўная творчасць), вывучаюцца практычныя прыёмы і метады работы з народным хорам, засвойваюцца найбольш яркія ў мастацкіх адносінах народныя выканальніцкія стылі.

Работа харавога класа ажыццяўляецца ў цесным узаемадзеянні з іншымі дысцыплінамі: “Беларуская народнапесенная творчасць”, “Расшыфроўка беларускіх народных песень”, “Аранжыроўка беларускіх народных песень”, “Сольныя спевы”, “Выканальніцкае майстэрства”, “Асновы сцэнруху, танец”.

*Мэта* дысцыпліны – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды ў галіне традыцыйнай харавой культуры Беларусі, вытокаў фальклорнага майстэрства, яго формаў бытавання, багацця лексічнага матэрыялу і шматграннай манеры выканання.

У прыватнасці, дысцыпліна “Харавы клас” ахоплівае пытанні, звязаныя з разнастайнасцю формаў і жанраў народнай песні, падборам і крытычным асэнсаваннем рэпертуарнага матэрыялу, прапагандай лепшых узораў традыцыйнай харавой культуры Беларусі.

У цесным спалучэнні з вывучэннем іншых дысцыплін падаецца методыка работы з народным хорам, выпрацоўка ўменняў і навыкаў інтэрпрэтацыі харавых твораў.

Асноўныя *задачы* дысцыпліны:

– засваенне навыкаў і прыёмаў народнапесеннага выканання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалодванне навыкамі спеваў у складзе фальклорнага ансамбля;

– набыццё ўменняў і навыкаў спеваў з рухамі;

– авалоданне манерай народных спеваў і спецыфічнымі прыёмамі традыцыйнага гукаўтварэння ва ўмовах калектыўнага выканання народнай песні;

– авалоданне пеўчымі стылямі розных рэгіёнаў Беларусі;

– выхаванне сцэнічных паводзін.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– дыялектныя асаблівасці розных рэгіёнаў Беларусі;

– прыёмы народнай манеры спеваў;

– традыцыйныя выканальніцкія прыёмы спеваў;

– народны хор, склад, тыпы, віды;

– характарыстыку галасоў;

– жанры народнай песні;

– вакальную работу ў народным хоры;

– элементы народнай харэаграфіі;

– прыёмы ігры на народных інструментах.

Выпускнік павінен *умець:*

– валодаць народнай манерай спеваў;

– выконваць народныя песні з элементамі руху;

– ужываць прынцыпы аранжыроўкі і апрацоўкі беларускіх народных песень;

– падабраць рэпертуар для народнага хору і арганізоўваць канцэртную дзейнасць калектыву;

– карыстацца прыёмамі ігры на народных інструментах;

– выконваць элементы і рухі народнага танца.

Праграма дысцыпліны “Харавы клас” рэалізуецца на практычных занятках, а таксама ў працэсе самастойнай работы. Па структуры заняткі ў харавым класе могуць быць тэматычнымі, камбінаванымі, манціровачнымі. Яны вызначаюцца характарам творчых праблем і задач, якія вырашаюцца ў харавым калектыве.

Асновай набыцця ведаў і ўменняў з’яўляюцца падрыхтоўка і ўдзел студэнтаў у канцэртных праграмах калектыву. У гэтых умовах праграма прадугледжвае абавязковую сістэму кантрольных патрабаванняў на пэўных этапах навучання, якая адпаведна ўлічвае розныя ўзроўні ведаў і ўменняў.

Канцэртна-выканальніцкая дзейнасць з’яўляецца адной з форм вучэбна-выхаваўчай работы з калектывам. У выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай дзейнасці актывізуецца працэс навучання спецыяліста высокай кваліфікацыі, які адпавядае ўзроўню сучаснага развіцця народна-харавога выканальніцтва.

Канцэртная практыка садзейнічае развіццю навыкаў калектыўнай творчасці, сцэнічнага пераўвасаблення, удасканаленню вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў, азнаямленню з методыкай арганізацыі канцэртнай дзейнасці харавога калектыву.

Выканальніцкая дзейнасць можа ажыццяўляцца ў форме святочных і тэматычных канцэртаў, творчых справаздач і ўдзелу ў іншых мерапрыемствах.

Для найбольш эфектыўнага засваення матэрыялу па дысцыпліне “Харавы клас” ужываюцца вучэбна-даследчыя тэхналогіі, якія прадугледжваюць вывучэнне фальклору (дыялектныя асаблівасці, бытавыя пеўчыя ансамблі, спецыфічныя прыёмы вымаўлення паэтычнага тэксту, песні каляндарна-абрадавага цыкла) і авалодванне народнай манерай спеваў (мясцовыя пеўчыя традыцыі, выпрацоўка адзінай манеры спеваў, перайманне “з голасу”, сувязь спеваў з асаблівасцямі дыялекту, спевы як у грудным, так і ў галаўным рэгістрах).

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Харавы клас” адводзіцца 750 гадзін, з якіх 336 – аўдыторныя (практычныя) заняткі. Рэкамендаваныя формы кантролю – экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін (практычных заняткаў) |
|---|---|
| **Уводзіны** | 2 |
| ***Тэма 1.*** Народная манера выканання беларускіх народных песень | 18 |
| ***Тэма 2.*** Асноўныя прыёмы народна-харавога выканання | 18 |
| ***Тэма 3.*** Пеўчае выхаванне народных спевакоў | 26 |
| ***Тэма 4.*** Выканальніцкая культура народнай песні | 22 |
| ***Тэма 5.*** Навыкі выканання народных песень у складзе невялікіх гуртоў | 18 |
| ***Тэма 6.*** Асноўныя навыкі выканання народных песень з элементамі руху | 18 |
| ***Тэма 7.*** Выкарыстанне спецыфічных вакальна-харэаграфічных прыёмаў народнапесеннага выканальніцтва | 22 |
| ***Тэма 8.*** Імправізацыя – адна з асаблівасцей выканання народных песень | 20 |
| ***Тэма 9.*** Дакладнае інтанаванне меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў | 18 |
| ***Тэма 10.*** Карагодныя і танцавальныя народныя песні. Асноўныя формы карагодаў | 16 |
| ***Тэма 11.*** Харавыя спевы без суправаджэння (a cappella) і ў суправаджэнні беларускіх народных інструментаў | 20 |
| ***Тэма 12.*** Работа над гучаннем голасу ва ўсіх рэгістрах | 20 |
| ***Тэма 13.*** Дыялектныя асаблівасці некаторых рэгіёнаў Беларусі | 18 |
| ***Тэма 14.*** Песні каляндарна-абрадавага цыкла | 20 |
| ***Тэма 15.*** Сцэнічная інтэрпрэтацыя танцавальных народных песень | 22 |
| ***Тэма 16.*** Увасабленне сцэнічнага вобраза ў час выканання беларускіх народных песень | 18 |
| ***Тэма 17.*** Падрыхтоўка творчай справаздачы харавога калектыву | 20 |
| Усяго… | 336 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Значэнне дысцыпліны "Харавы клас" у фарміраванні музычна-эстэтычнай культуры, пашырэнні музычнага кругагляду, паглыбленні спецыяльных ведаў, развіцці творчых навыкаў харавога выканальніцтва сродкамі вывучэння лепшых узораў народнай песеннай творчасці.

### *Тэма 1. Народная манера выканання беларускіх народных песень*

Народная манера спеваў як комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў, якія склаліся на аснове пеўчых традыцый пад уздзеяннем бытавога пеўчага асяроддзя.

Уплыў адзінай манеры спеваў на строй, ансамбль, тэмбравае гучанне народнага хору.

Мясцовая манера спеваў – аснова выканальніцкага майстэрства харавога калектыву.

Асаблівасці выпрацоўкі адзінай манеры спеваў у сучасных народных харавых калектывах, не маючых пеўчых традыцый.

Перайманне "з голасу" народнай манеры – адзін з метадаў вакальнага выканання. Сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, паэтычнай мовы і выканальніцкага вопыту пакаленняў народных спевакоў адной мясцовасці.

Спевы ў грудным рэгістры ў манеры, блізкай да моўнага пасылу гуку на аснове правільнага пеўчага дыхання, апоры гуку, натуральнага рэзаніравання і сэнсавага інтанавання музычна-паэтычнага тэксту харавога твора.

### *Тэма 2. Асноўныя прыёмы народна-харавога выканання*

Спецыфічныя прыёмы выразнасці.

Сольны запеў як своеасаблівая падрыхтоўка да харавога выканання.

Дыкцыя і сінхроннасць вымаўлення паэтычнага тэксту.

Адзінства і цэласнасць успрымання мастацкага вобраза ў час выканання народнай песні.

Выпрацоўка гуку, блізкага да гаворкавай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Натуральны “блізкавы” гук, нязначная вібрацыя голасу, натуральнае галаўное рэзаніраванне без яскрава прыкрытага голасу, поўнае грудное гучанне.

Выпрацоўка адзінай манеры гукаўтварэння, у тым ліку навыкаў стройных ансамблевых спеваў, выразнай дыкцыі.

### *Тэма 3. Пеўчае выхаванне народных спевакоў*

Перайманне голасу – адзін з метадаў пеўчага выхавання.

Сістэматычныя заняткі па фарміраванні пеўчых навыкаў. Работа над дыханнем, гукам і дыкцыяй.

Прынцып ланцужковага дыхання.

Правільнае пеўчае дыханне – аснова харавога гучання твора.

Выразнасць і яснасць перадачы слова – аснова народнага выканання.

Залежнасць пеўчай дыкцыі ад фанетыкі гаворкавай мовы.

Навыкі спеваў у галаўным рэгістры.

Пашырэнне дыяпазону галасоў.

Прынцып пераходу спеваў з аднаго рэгістра ў другі.

Мікставыя – пераходныя гукі высокіх жаночых галасоў.

Выпрацоўка навыкаў злучэння рэгістра.

Роля распявання ў пеўчым выхаванні народных спевакоў. Спецыфічнасць практыкаванняў для харавога калектыву.

Роля запявалы ў харавым выканальніцтве народных песень.

### *Тэма 4. Выканальніцкая культура народнай песні*

Шчырасць, непасрэднасць, эмацыянальнасць выканання народнай песні.

Аднолькавае ўспрыманне спевакамі драматургічнай лініі выконваемага твора. Дэталёвая нюансіроўка і яе сувязь з паэтычным тэкстам у час выканання харавой партытуры.

Выразнасць вымаўлення тэксту як адзін з важных сродкаў народна-выканальніцкага майстэрства.

Дакладнае інтанаванне пэўных меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў.

Спевы ва ўнісон і актаву.

Агульнапрынятыя нормы паводзін спевака на сцэне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Навыкі выканання народных песень у складзе невялікіх гуртоў*

Ансамблевае гучанне галасоў невялікага гурту.

Вольнае валоданне ўсімі рэгістрамі голасу, а таксама плаўным і поўным пераходам з аднаго рэгістра ў другі.

Пашырэнне дыяпазону галасоў вакальнай групы за кошт згладжвання рэгістраў пры захаванні тэмбравай якасці і моцы гучання.

Авалодванне навыкамі спеваў у мікставым і галаўным рэгістрах.

Спевы на ланцужковым дыханні на працягу ўсяго гучання харавога твора.

### *Тэма 6. Асноўныя навыкі выканання народных песень з элементамі руху*

Вытокі развіцця беларускага народнага танца. Беларускі народны танец і яго выкарыстанне ў час выканання беларускай народнай песні.

Асноўныя прыёмы выкарыстання карагодных, гульнёвых і танцавальных песень. Выкарыстанне паэтычнага тэксту ў народных спевах і спевах з элементамі руху.

Авалодванне пеўчым дыханнем, звязаным з тэмпам і рухам у карагодных песнях і падтанцоўках.

Замацаванне і развіццё навыкаў і ўменняў выканання песенна-танцавальных нумароў у традыцыйнай форме народнапесеннага выканальніцтва.

### *Тэма 7. Выкарыстанне спецыфічных вакальна-харэаграфічных прыёмаў народнапесеннага выканальніцтва*

Асноўныя песенна-танцавальныя стылі розных рэгіёнаў Беларусі.

Карагод як самы распаўсюджаны жанр беларускага народна-харавога выканальніцтва.

Гульнёвыя карагоды і іх песенная аснова.

Арнаментальныя карагоды як абрамленне паэтычнага тэксту. Навыкі спеваў у час руху па крузе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дэталёвая работа над зместам гульнёвых песень, выразнасцю ўсіх мізансцэн і сцэнічнай актыўнасцю ўдзельнікаў хору ці фальклорнага гурту.

Выкананне народнай песні з адначасовым выкарыстаннем ускладненых карагодаў і падтанцовак.

### *Тэма 8. Імправізацыя – адна з асаблівасцей выканання народных песень*

Роля імправізацыі ў час выканання народнай песні.

Прынцып “падгалошвання”, прыпявання і надстройвання падгалоскаў да асноўнага напеву ў хоры.

Развіццё пеўчых навыкаў імправізацыі.

Спевы з падгалоскамі ва ўмовах выканання бытавых народных песень.

Харавыя распевы песень, раней запісаных у адзін голас.

Стварэнне невялікіх творчых груп, якія “распяваюць” мелодыю на некалькі галасоў. Расстаноўка спевакоў на сцэне ў час імправізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Дакладнае інтанаванне меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў*

Спевы ў складзе харавога калектыву з дзяленнем на дзве–тры групы ў дыяпазоне груднога рэгістра.

Правільнае інтанаванне характэрных інтэрвалаў.

Асаблівасці інтанавання гарманічных гукаспалучэнняў.

Навыкі стройных ансамблевых спеваў.

Чыстата інтанавання за кошт разумення рытмічнага малюнка і эмацыянальна-вобразнага зместу харавога твора.

Асваенне характэрных прыёмаў народна-харавога і сольнага выканання (глісандзіраванне, спад, скіданне і інш.).

### *Тэма 10. Карагодныя і танцавальныя народныя песні. Асноўныя формы карагодаў*

Асноўныя элементы беларускіх карагодаў і іх выкарыстанне ў рэпертуары фальклорных гуртоў і харавых калектываў.

Веснавыя карагоды, купальскія карагоды.

Гарадскі бытавы танец і яго выкарыстанне ў рэпертуары народна-харавых калектываў.

Прытанцоўкі ў час выканання танцавальных і жартоўных народных песень.

Элементы харэаграфіі пры выкананні абрадавых, каляндарных і гульнёвых песень.

### *Тэма 11. Харавыя спевы без суправаджэння (a cappella) і ў суправаджэнні беларускіх народных інструментаў*

Спевы a cappella – аснова бытавання беларускай народнай песні.

Песні каляндарна-абрадавага цыкла: зімовыя, калядныя, валачобныя, веснавыя, велікодныя, купальскія, юр'еўскія, мікольскія, траецкія, жніўныя і інш.

Спевы ў суправаджэнні беларускіх народных інструментаў.

Склад інструментальнай групы і яго выкарыстанне ў народна-харавых калектывах.

Авалодванне навыкамі ігры на ўдарных (шумавых) народных інструментах.

Гармонь і яе выкарыстанне для суправаджэння прыпевак, жартоўных танцавальных нумароў і ў якасці сольнага інструмента.

### *Тэма 12. Работа над гучаннем голасу ва ўсіх рэгістрах*

Спевы ў грудным, галаўным мікставым рэгістрах.

Развіццё галаўнога рэгістра ў высокіх народных галасоў.

Плаўны пераход з аднаго рэгістра ў другі.

Захаванне груднога рэзаніравання пры пераходзе ў галаўны рэгістр і захаванне галаўнога рэгістра пры пераходзе ў грудны рэгістр.

Авалодванне некаторымі прыёмамі пераходу з аднаго рэгістра ў другі.

Мікставае гучанне галасоў пры пераходзе з аднаго рэгістра ў другі.

### *Тэма 13. Дыялектныя асаблівасці некаторых рэгіёнаў Беларусі*

Дыялектныя асаблівасці некаторых рэгіёнаў Беларусі як адлюстраванне беларускай песеннай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бытавыя пеўчыя ансамблі і іх роля ў захаванні дыялектных асаблівасцей розных рэгіёнаў Беларусі.

Выкарыстанне спецыфічных вымаўленчых прыёмаў пры развучванні паэтычнага тэксту народных песень.

Вывучэнне дыялектных асаблівасцей розных рэгіёнаў Беларусі.

Выкананне народных песень з захаваннем некаторых асаблівасцей рэгіянальных дыялектаў.

### *Тэма 14. Песні каляндарна-абрадавага цыкла*

Каляндарна-земляробчыя і абрадавыя песні – неад'емная частка культуры беларускага народа.

Асноўныя сюжэты сямейных песень і песень каляндарна-абрадавага цыкла.

Зімовыя песні (калядныя, масленічныя, грамнічныя, валачобныя).

Беларускія вяснянкі (гуканне вясны, веснавыя карагоды, гульні).

Песні летняга перыяду (купальскія песні, купальскія карагоды, зажынкі і дажынкі).

Восеньскія песні (святкаванне спаса, багача, пакроў).

Асноўныя персанажы абрадавых песень ("каза", "жораў", "дзед", "баба", "цыган", "ведзьма", "русалка" і інш.).

### *Тэма 15. Сцэнічная інтэрпрэтацыя танцавальных народных песень*

Народнапесенная выканальніцкая традыцыя – аснова работы над песнямі з элементамі руху.

Карагодныя, гульнёвыя, жартоўныя народныя песні. Прыпеўкі і падтанцоўкі.

Спецыфіка выканання народных песень з элементамі руху.

Асноўныя элементы беларускага народнага танца.

Уменне ўжываць традыцыйную беларускую харэаграфію як абрамленне песні (падтанцоўка).

Асноўныя запісы танцавальнага фальклору і іх выкарыстанне ў рэпертуары фальклорных гуртоў.

Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах песень каляндарна-абрадавага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 16. Увасабленне сцэнічнага вобраза ў час выканання беларускіх народных песень*

Значэнне паэтычнага тэксту для поўнага раскрыцця драматургічнай лініі, эмацыянальнага настрою і стварэння сцэнічных вобразаў.

Авалодванне навыкамі акцёрскага майстэрства.

Асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага вобраза.

Асноўныя сюжэты беларускіх абрадавых песень.

Сцэнічныя вобразы ў веснавых абрадах.

Асаблівасці акцёрскага майстэрства ў час выканання роляў некаторых персанажаў купальскіх абрадаў і абрадаў зімовага перыяду.

### *Тэма 17. Падрыхтоўка творчай справаздачы харавога калектыву*

Прынцыпы падбору рэпертуару канцэртнай праграмы.

Замацаванне навыкаў народнага выканання з улікам народна-пеўчых традыцый розных рэгіёнаў Беларусі.

Асноўныя прынцыпы рэжысуры канцэртнай праграмы: ідэйная накіраванасць, развіццё агульнай драматычнай лініі (завязка, кульмінацыя і фінал), лагічнае выкарыстанне харэаграфіі і персанажаў беларускіх народных абрадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Прыкладны рэпертуар

### *Беларускія народныя песні*

А калі той вечар. Апр. М.Сіраты
А ў сенях, сенях. Апр. В.Рамановіча
А я чарнява. Апр. С.Дробыша
Біла жонка мужыка. Апр. М.Сіраты
Бяседная. Апр. М.Сіраты
Вол бушуе… Апр. М.Дрынеўскага
Вяне рута. Апр. К.Паплаўскага
Вярба, вярба. Апр. М.Сіраты
Гай зеляненькі. Апр. С.Дробыша
Добры вечар, дзяўчыненька. Апр. Н.Баканавай
Дубравушка. Апр. С.Бяражнога
Ды ў зялёнай дуброве. Апр. Г.Цітовіча
Ды ўжо сонейка. Апр. К.Паплаўскага
Ды што ў садзе лялеіцца. Апр. Г.Цітовіча
Жавароначкі, прыляціце. Апр. Г.Цітовіча
За гарамі, за лясамі. Апр. Э.Наско
Занімаецца зара. Апр. С.Бяражнога
І туды гара… Апр. М. Сіраты
Із-пад гор-гары. Апр. М.Сіраты
Калі каліна не цвіла. Апр. А.Казака
Каля кузні ішла. Апр. С.Дробыша
Каля майго церама. Апр. Ю.Смялкоўскага
Камар лазню тапіў. Апр. І.Кузняцова
Караводная. Апр. Н.Сакалоўскага
Кукавала зязюля. Апр. К.Паплаўскага
Купальскія разгары. Апр. М.Сіраты
Лайдакі. Апр. М.Сіраты
Лянок. Апр. Г.Цітовіча
Ляціць сарока. Апр. К.Паплаўскага
На вуліцы мокра. Апр. С.Дробыша
Ой, да белая бяроза. Апр. Г.Цітовіча
Ой, дзе ж ты была. Апр. С.Дробыша
Ой, забялелі снежкі. Апр. У.Зяневіча
Ой, зелена, зелена. Апр. М.Сіраты
Ой, ляцелі гусі. Апр. Н.Сакалоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ой, павей, буйны вецярочак. Апр. К.Паплаўскага
Ой, рана на Йвана. Апр. М.Дрынеўскага
Ой, сівы конь бяжыць. Апр. А.Кашпура
Ой, там, на гарэ. Апр. М.Сіраты
Ой ты, грушка. Апр. М.Дрынеўскага
Ой, у лесе, лесе. Апр. М.Корсака
Ой, у полі азярэчка. Апр. С.Дробыша
Ой, у полі туманочак. Апр. М.Дрынеўскага
Ой, у полі. Апр. Н.Сакалоўскага
Алень по бору ходзіць. Апр. К.Яськова
Па грыбы пайшла. Апр. С.Дробыша
Па рацэ, рацэ гаголушка плыве. Апр. У.Зяневіча
Пайшла Марта. Апр. С.Дробыша
Пасеялі дзеўкі лён. Апр. Ф.Стацэнка
Пойдзем, дзевачкі. Апр. У.Зяневіча
Прымакі. Апр. С.Дробыша
Рэчанька. Апр. Г.Цітовіча
Там, дзе ручалачка бяжала. Апр. А.Шагава
У горадзе Слуцку. Апр. М.Сіраты
У нас сягоння купалачка. Апр. У.Зяневіча
У садзе гуляла. Апр. М.Корсака
Цераз рэчаньку. Апр. М.Дрынеўскага
Ці ўсе лугі пакошаны. Апр. І.Кузняцова
Цячэ рэчка. Апр. М.Сіраты
Чаму ж мне не пецъ. Апр. М.Сіраты
Што за лесам. Апр. М.Сіраты
Я каліну ламала. Апр. М.Сіраты
Як сарву я ружы кветку. Апр. К.Сакалоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Алексютович, Л.К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л.К.Алексютович; под ред. М.Я.Гринблата. – Минск: Выш. шк., 1978. – С. 28–37, 412–437.

2. *Антаневіч, В.* Шляхі выкарыстання фальклору ў сучаснай беларускай музыцы (60–70-я гг.) / В.Антаневіч // Беларуская музыка. – Мінск, 1978. – Вып. 3. – С. 62–71.

3. *Гребенщиков, С.М.* Белорусская народно-сценическая хореография / С.М.Гребенщиков. – Минск: Наука и техника, 1976. – С. 175–204.

4. *Гребенщиков, С.* Сценические белорусские народные танцы / С.Гребенщиков. – Минск: Наука и техника, 1978. – С. 3–24.

5. *Земцовский, И.И.* О природе фольклора в свете исполнительского общения / И.И.Земцовский // Искусство и общение. – М., 1984. – С. 18–29.

6. *Калугина, Н.В.* Методика работы с народным хором: учебник для муз. вузов / Н.В.Калугина. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Музыка, 1977. – С. 24–32, 66–81.

7. *Мешко, Н.К.* Вокальная работа с исполнителями русских народных песен / Н.К.Мешко // Клубные вечера. – М., 1976. – № 3. – С. 95–103.

8. *Мешко, Н.К.* Еще раз о народных хорах / Н.К.Мешко // Советская музыка. – М., 1974. – № 1. – С. 22–23.

9. *Мешко, Н.К.* Чтобы учить, нужно учиться / Н.К.Мешко // Клуб и художественная самодеятельность. – М., 1964. – № 20. – С. 15–19.

10. *Мухаринская, Л.С.* Композитор, этнограф, хоровой дирижер / Л.С.Мухаринская // Советская музыка. – М., 1980. – № 12. – С. 17–20.

11. *Мухарынская, Л.С.* Цітовіч ва ўспамінах сучаснікаў / Л.С.Мухарынская. – Мінск, 1990. – С. 17–25.

12. *Руднева, С.* Ритмика. Музыкальное движение / С.Руднева, Э.Фиш. – М.: Просвещение, 1972. – С. 334–346.

13. *Цитович, Г.И.* О белорусском песенном фольклоре / Г.И.Цитович. – Минск, 1976. – 127 с.

14. *Чурко, Ю.М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю.М.Чурко. – Минск: Выш. шк., 1990. – С. 325–349.

15. *Широков, А.С.* Работа над песней в народном хоре / А.С.Широков // Художественная самодеятельность. – М., 1959. – № 7. – С. 17–28.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1. Алексеев, Э.* Музыкальный фольклор и музыкальная самодеятельность / Э.Алексеев // Народное творчество в культуре развитого социалистического общества. – М.: Музыка, 1984. – С. 28–40.

*2. Антипова, Л.* Русский народный детский хор / Л.Антипова // Клуб и художественная самодеятельность. – М., 1971. – № 13. – С. 46–61.

*3. Баранов, В.* Русский народный хор. Сценическое воплощение песни / В.Баранов // Клуб и художественная самодеятельность. – М., 1971. – № 13. – С. 15–37.

*4. Грибанова, В.* Русский народный хор. Вокальная работа в народном хоре / В.Грибанова // Клуб и художественная самодеятельность. – М., 1971. – № 17. – С. 17–39.

*5. Засимова, Е.* Русский народный хор. Особенности работы руководителя / Е.Засимова // Клуб и художественная самодеятельность. – М., 1971. – № 19. – С. 15–27.

*6. Красовская, Ю.* Концертная жизнь народной песни / Ю.Красовская // Советская музыка. – М., 1971. – № 4. – С. 12–15.

*7. Кабанов, А.* Воспитательное воздействие музыкального фольклора на участников художественной самодеятельности / А.Кабанов // Художественная самодеятельность. Традиция, мастерство, воспитание: сб. науч. тр. – М.: НИИ культуры, 1985. – Вып. 14. – С. 111–137.

*8. Кондратьев, С.* Художественная самодеятельность и фольклор (к проблеме народного хора) / С.Кондратьев // Народное творчество. Вопросы музыкальной самодеятельности и фольклора: сб. науч. тр. – М.: НИИ культуры, 1974. – Вып. 20. – С. 24–32.

*9. Лукьянова, Т.* Внимание исполнительству в фольклоре / Т.Лукьянова. – М.: Советская музыка, 1973. – № 13. – С. 15–23.

*10. Рубцов, Ф.* Русские народные хоры и псевдонародные песни / Ф.Рубцов // Статьи по музыкальному фольклору. – Л.: Музыка, 1973. – № 6. – С. 14–27.

*11. Рубцов, Ф.* Хоровые коллективы русской народной песни / Ф.Рубцов // Проблемы музыкальной самодеятельности. – М., 1965. – С. 17–32.

*12. Христиансен, Л.* Работа с народными певцами / Л.Христиансен // Вопросы вокальной педагогики: сборник. – М., 1976. – № 5. – С. 11–19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Нотная літаратура*

1. *Гром, У.М.* Зайграйце, музыкі: рэпертуарны зборнік для фальклорных калектываў. Ч. 2 / У.М.Гром. – Мінск: Чатыры чвэрці, 1998. – 155 с.

2. *Дробыш, С.І.* Дырыжыраванне: хрэстаматыя для народнага хору / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 297 с.

3. *Дробыш, С.І.* "І песню родную люблю я…": вучэб.-метад. дапам. / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава. – Мінск: Друкарня РУП "Промпечать", 2008. – 120 с.

4. *Дробыш, С.І.* Хрэстаматыя па дырыжыраванні народным хорам / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.М.Міхліна. – Мінск: Беларусь, 1991. – 143 с.

5. *Несцяровіч, Г.Д.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб. дапам. / Г.Д.Несцяровіч, Л.І.Холупава, А.І.Дубавец. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 152 с.

6. *Холупава, Л.І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам. / Л.І.Холупава, І.М.Грамовіч, Л.Л.Ражкова. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

7. *Цітовіч, Г.* Анталогія беларускіх народных песень / Г.Цітовіч. – 2-е выд. – Мінск: Беларусь, 1975. – 616 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі вынікаў вучэбнай дзейнасці

### *Балы, паказчыкі адзнакі*

***1 (адзін)*** – слабыя музычныя і вакальныя даныя; адсутнасць ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; адмаўленне ад адказу.

***2 (два)*** – слабыя музычныя і вакальныя даныя; дрэнная інтанацыя; слабыя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; адмаўленне ад адказу на большасць пытанняў па дысцыпліне.

***3 (тры)*** – слабыя вакальныя даныя; цьмяны тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; дрэннае валоданне пеўчым дыханнем; слабая апора гуку; няўпэўненае выкананне сваёй партыі кожнага харавога твора; няўменне правільна выконваць дынамічныя адценні; несур'ёзныя адносіны да паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; няўменне пераканаўча ўвасабляць сцэнічны вобраз; няўмелае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; невыкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); недастатковы аб'ём ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; няпоўныя адказы на пытанні па дысцыпліне.

***4 (чатыры)*** – не зусім здаровы галасавы апарат; пасрэдныя вакальныя даныя; недастаткова яскравы тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; няўменне правільна размяркоўваць пеўчае дыханне; няўстойлівая апора гуку; недастаткова ўпэўненае выкананне сваёй партыі кожнага харавога твора; няўпэўненае выкананне дынамічных адценняў; павярхоўнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; няўпэўненае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; слабае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); недастатковы аб'ём ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; няпоўныя адказы на пытанні па дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***5 (пяць)*** – некаторыя праблемы галасавога апарата; сярэднія вакальныя даныя; некаторыя недахопы тэмбру голасу; няўстойлівая інтанацыя; пэўныя дэфекты дыкцыі; няўмелае карыстанне ланцужковым дыханнем; недастатковая апора гуку; няўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; дапушчэнне памылак пры выкананні сваёй партыі кожнага харавога твора; няўпэўненае выкананне дынамічных адценняў; недастатковае разуменне паэтычнага тэксту; няўпэўненае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; пэўныя цяжкасці валодання элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; недастаткова поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); недастатковы аб'ём ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; пасрэдныя адказы на пытанні па дысцыпліне.

***6 (шэсць)*** – некаторыя праблемы галасавога апарата; пасрэдныя вакальныя даныя; некаторыя недахопы тэмбру голасу; няўстойлівая інтанацыя; некаторыя дэфекты дыкцыі; не зусім умелае карыстанне ланцужковым дыханнем; слабая апора гуку; недасканалае ўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; некаторыя памылкі пры выкананні сваёй партыі кожнага харавога твора; няўпэўненасць пры выкананні дынамічных адценняў; няўпэўненасць у паразуменні паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; недасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; слабае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); павярхоўны аб'ём ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; недастатковыя адказы на пытанні па дысцыпліне.

***7 (сем)*** – нязначныя праблемы галасавога апарата; недастатковыя вакальныя даныя; нязначныя недахопы тэмбру голасу; інтанацыя з нязначнымі недахопамі; добрая дыкцыя; нязначныя памылкі пры выкананні харавой партыі на ланцужковым дыханні; недахопы пры спевах у ансамблі з другімі харавымі партыямі; недастатковая апора гуку; уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; ня-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значныя памылкі пры выкананні сваёй партыі кожнага харавога твора; выкананне дынамічных адценняў з нязначнымі памылкамі; правільнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; не зусім дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; нядрэннае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; не зусім поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); недастатковыя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; добрыя адказы на пытанні па дысцыпліне.

***8 (восем)*** – здаровы галасавы апарат; добрыя вакальныя даныя; дастаткова яскравы тэмбр голасу; добрая інтанацыя; добрая дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне співаць у ансамблі з другімі харавымі партыямі; дастаткова добрая апора гуку; уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; упэўненае веданне сваёй партыі; уменне валодаць усімі дынамічнымі адценнямі; дастаткова правільнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; правільнае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; добрае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); дастатковыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў рамках адукацыйнага стандарту.

***9 (дзевяць)*** – здаровы галасавы апарат; выдатныя вакальныя даныя; яскравы тэмбр голасу; добрая інтанацыя; выразная дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне співаць у ансамблі з другімі харавымі партыямі; добрая апора гуку; уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; дасканалае веданне сваёй партыі кожнага харавога твора; уменне выконваць усе дынамічныя адценні; добрае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза; свабоднае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элемен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тамі вакальна-харавой тэхнікі); глыбокія веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту.

***10 (дзесяць)*** – здаровы галасавы апарат; выдатныя вакальныя даныя; яскравы, прыгожы тэмбр голасу; ідэальная інтанацыя; выразная, без дэфектаў, дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне; уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі; устойлівая апора гуку; уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; дасканалае веданне сваёй партыі кожнага харавога твора; дэталёвае валоданне ўсімі дынамічнымі адценнямі; выдатнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора; свабоднае валоданне элементамі руху пры выкананні карагодных і танцавальных песень; творчы падыход да стварэння сцэнічнага вобраза; поўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце (колькасць харавых твораў, якасць выканання харавых партый, дасканалае валоданне ўсімі элементамі вакальна-харавой тэхнікі); сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах у рамках адукацыйнага стандарту.

## Сродкі дыягностыкі

Чытанне з ліста харавых партый.

Спевы харавых партый на памяць.

Праверка паэтычнага тэксту ў час заняткаў.

Апытанне (вызначэнне жанру народных песень, асаблівасці харавой партытуры, асацыятыўнае ўспрыманне драматургічнай лініі харавога твора).

Выканальніцкі аналіз харавой партытуры.

Абарона справаздач па вытворчай практыцы.

Вусны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ХАРАВЫ КЛАС**

**Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)
напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,37. Ул.-выд. арк. 0,81.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ